УДК 81:008

# МОВА ПЕРАМОГІ: ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**А.А. Мелех, Д.Д. Сяргеева**, 10 “А” клас, **Р.А. Цярэшка**, 11 “Б” клас
Навуковы кіраўнік – **Н.У. Магер**, настаўнік
**Ліцэй Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта**

Свята Вялікай Перамогі з’яўляецца найважнейшай часткай агульнай гісторыі народаў былога Савецкага Саюза, аб’яднаных імкненнем захаваць гістарычную памяць аб Вялікай Айчыннай вайне і перадаць яе наступным пакаленням. Менавіта таму ў год 80-годдзя Вялікай Перамогі мы вырашылі прааналізаваць беларускія прыказкі і прымаўкі, складзеныя ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Прыказкі і прымаўкі, створаныя за гады Вялікай Айчыннай вайны, праўдзіва адлюстравалі:

героіку ваенных гадоў:

*Народ таго заве героем, хто б’е фашыстау смертным боем.*

*Пераступілі фашысты наш парог ды асталіся хто без рук, а хто без ног.*

*Разагнаўся фашыст на нашу зямлю, ды паслізнуўся, што не ўстаў.*

*Фашысты колькі ішлі на Бягомль, столькі назад беглі бягом;*

усенародны патрыятычны ўздым:

*Лепей смерць на полі, чым мукі ў няволі.*

*На радзіме і паміраць лягчэй.*

*Усякая птушка свае гняздо бароніць;*

бязлітасную барацьбу савецкіх людзей з фашысцкімі захопнікамі:

*Дасі фашысту ў рабро - зробіш сабе дабро.*

*Для нас капаюць ямы, ды лягуць у іх самі.*

*Не мялі языком, а калі штыком.*

*Раней Гітлер выцягне ногі, чым даб’ецца перамогі.*

*Смела ідзі ў бой - Радзіма за табой!*

*Хочаш шчасця для рабочых і сялян - ідзі ў атрады партызан.*

*Штык савецкі - у жывот нямецкі.*

У прыказках адлюстроўвалася лютая нянавісць савецкага народа да гітлераўскіх катаў, да іх войска, да іх “новага парадку”:

*Абяцаюць зямлю - надзяваюць пятлю.*

*Гітлеры ды Чэрчылі - чэрці адной шэрсці.*

*Дзень пражыць - фашыста ўлажыць.*

*Кожнай фашысцкай гадзіне вісець на перакладзіне.*

*Кожнаму воўку ў горла па асколку.*

*Новыя парадкі - пятля ды падаткі.*

*У фашыста рот чорны.*

*Фашыст за сталом - свіння ў карыце.*

Прыказкі праславілі воінскае майстэрства савецкіх людзей, знаходлівасць нашых воінаў у баі, іх розум і вытрымку:

*Для фашыста па ўсёй Беларусі Удранкі* (прыказка ўзнікла ў Маладзенчыскім раёне пасле разгрому партызанамі вясною 1943 г. нямецка-фашысцкага гарнізона ў пасёлку Удранка, які ў прыказцы звязалі з рускім дзеяясловам *удрать*).

*Мы і там, мы і тут - так і Гітлеру капут.*

*На фашыста і вяроўка - зброя.*

*На фашыста і камяня - зброя.*

*Партызан не разбіраў, чым фашыста-гада біць.*

*Цёмная ночка - дзень партызанскі.*

Савецкі народ захаваў у кароткіх і трапных азначэннях славу сваёй зброі, сваіх перамог, сваіх подзвігаў, свой гераізм, які змятае на сваім шляху ўсе перашкоды:

*Ад нашага «ўра» дрыжэла немчура.*

*Гітлер Берлін прасвістаў, а Масквы не дастаў.*
*Гітлеры ды Чэрчылі не раз ад злосці (зайздрасці) енчылі.*
*Жартаваў воўк з канём, ды у жмені зубы панёс.*
*Ішой да нас ваякам, а назад папоўз ракам.*
*Ішой кустамі Карл па кашу - і дух спусціў ад кулі нашай.*
*Крычаў, крычаў «гоп» ды схапіў кулю ў лоб.*
*Не хапае толькі ног: ногі пад Масквою.*

Прыказкі і прымаўкі існавалі на фронце з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Яны друкаваліся ў газетах і часопісах, распаўсюджваліся ва ўлётках, уваходзілі ў паўсядзённае жыццё дзейнай арміі. Савецкі народ паставіў гэтыя трапныя і мудрыя выслоўі на службу Радзіме. Прыказкі служылі фронту і ў вялікай колькасці ўзнікалі на фронце.

Прыказкі і прымаўкі нараджаліся ў бітвах на працягу ўсёй вайны. Яны пераходзілі з вуснаў у вусны, асядалі ў памяці савецкіх воінаў і служылі ім баявымі лозунгамі. Вось некалькі прымаўак якія склаліся на фронце і гаворачых аб магутным пачуцці патрыятызму:

*З роднага боку і варона мілая.*
*Кожнаму дразду жаль па сваім гнязду.*
*У роднай староначцы птушачкі пяюць, а ў чужой староначцы часта слёзы льюць.*

Народ любіць адвагу. Ён апявае герояў, людзей, якія не здрыгануцца ў баі, акружаныя ворагамі, не здадуцца. Пра такіх герояў-патрыётаў на фронце створана мноства сказаў, песень, прыказак, прымавак. Усе яны заклікалі воінаў не баяцца смерці, выхоўвалі ў іх веру ў жыццё, у перамогу:

*Народ таго заве героем, хто б'е фашыстау смертным боем.*
*Дасі фашысту ў рабро – зробіш сабе дабро.*
*Малая граната, ды многа толку.*
*На рацэ Удра падалі фашысты ад аднаго нашага "ўра".*
*Смела ідзі ў бой – радзіма за табой.*
*Штык савецкі – у жывот нямецкі.*

Усё гэта служыла асноўнай мэце: узнімаць баявы дух воінаў, падтрымліваць у іх наступальны парыў, умацоўваць іх волю да самай рашучай, упартай барацьбы з ворагам за нашы родныя гарады і вёскі, за нашу Радзіму. Вось найболей распаўсюджаныя заклікі дывізіённых і вайсковых газет, якія існавалі ў жывой гаворцы франтавікоў:

У зямлянках і бліндажах, на маршы і на прывалах - усюды жыла вусная народная творчасць, узнімаючы настрой савецкіх воінаў. У ім гучалі непераможная воля да барацьбы, згуртаванасць, яднанне савецкіх людзей у абароне сваёй Айчыны.

Вайна, якую на працягу чатырох гадоў вёў савецкі народ супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, завяршалася. Народ перамагаў блізкую перамогу. Слова "перамога" гучала з невымоўнай сілай. Яно было на вуснах у кожнага савецкага грамадзяніна, у кожнага воіна. Яно дадавала сілы, акрыляла савецкіх людзей, узмацняла ў войсках Савецкай арміі наступальны парыў, які знайшоў адлюстраванне ў такіх франтавых прыказках і прымаўках:

*У Пцічы ракаў напладзілася: багата фашыстаў патапілася.*
*Тут былі фашыстам куры, тут былі ім і хаўтуры.*
*Не хапае толькі ног: ногі пад Масквою.*
*Мы і там, мы і тут – так і Гітлеру капут.*

Творцамі і носьбітамі франтавога фальклору былі людзі разнастайных ваенных прафесій, спецыяльнасцей, рознага культурнага ўзроўню. Адгэтуль і разнастайнасць і featured рознабаковая тэматыка, якія існавалі ў войсках прыказак і прымаўак. Многія прыказкі і прымаўкі, створаныя ў гады вайны, застануцца выдатнымі помнікамі гераічнай гісторыі савецкіх людзей, будуць доўга служыць напамінам аб доблесці савецкіх воінаў, аб іх геройстве, славе і бясстрашнасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад.Ф. Янкоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 493 с.

2. Маслова В.А. Введение в лингвокультурологию. М., 1997